**Państwo – Demokracja – Chłopi. Studia z historii społeczno-politycznej Polski (XVII–XX w.). Tom studiów dedykowany Profesorowi Romualdowi Wacławowi Turkowskiemu z okazji 65-lecia urodzenia i 40-lecia pracy dydaktyczno-naukowej** / Pod red. S. J. Pastuszki i J. Sztejnbis-Zdyb. Warszawa – Kielce – Pułtusk, 2016. 855 s.

**State – Democracy – Peasants. The collection of research on the social and political history of Poland (XVII – XX centuries). The book is dedicated to Professor Romuald Wacław Turkowski for his 65$^{th}$ anniversary and 40$^{th}$ anniversary of his scientific and didactic activities** / ed. by S. J. Pastuszka and J. Sztejnbis-Zdyb. Warsaw – Kielce – Pułtusk, 2016. 855 p.

Прафесар Варшаўскага ўніверсітэта доктар хабілітаваны Рамуальд Вацлаў Туркоўскі з'яўляецца вядомым спецыялістам па гісторыі сялянскага руху ў Польшчы і Чэхаславакіі ў ХХ ст. Акрамя гэтага, у яго навуковым багажы ёсць шматлікія працы, прысвечаныя гісторыі польскіх эміграцкіх структур у 1945–1990 гг., шматтомнае выданне дакументаў па гісторыі Польшчы ў ХХ ст. і інш. Беларускім даследчыкам імя прафесара Туркоўскага знаёмае па публікацыях у навуковым зборніку «Российские и славянские исследования»[1], у рэдакцыйны савет якога ён уваходзіў пачынаючы з 2009 г.

Разглядаемая праца прысвечана дзвюм датам: 65-гадоваму юбілею прафесара Р. Туркоўскага і 40-годдзю яго навукова-дыдактычнай дзейнасці. Выданне пачынаецца словамі віншавання юбіляра, яго біяграфіяй, спісам навуковых прац за 1976–2016 гг., пералікам найбольш вядомых яго вучняў і тэм іх дысертацый (с. 11–76). Асноўны змест кнігі падзелены на 7 раздзелаў: «Парламентарызм, сяляне, палітыка», «Сялянскія лідары і дзеячы», «Рэлігія, асвета і культура», «Абарона і бяспека краіны», «Здароўе і сацыяльная апека», «Пазіцыя і памкненні маладога вясковага пакалення», «Varia».

У першым раздзеле прадстаўлены нарыс М. Адамчыка аб гісторыі сялянскага руху як руху палітычнага, які налічвае больш за 120 год. Праца Я. Гмітрука характарызуе выбарчы досвед сялянскага руху і ступень удзелу ў палітычным жыцці Польскай рэспублікі на працягу ўсяго перыяду існавання. Аўтар адзначае дасягненні і цяжкасці ў дзейнасці палітыкаў, якія ў сучаснай Польшчы выступаюць ад імя сялян.

Гаворачы пра палітычныя традыцыі Польшчы, К. Айеўскі звяртае ўвагу на амаль дэтэктыўную гісторыю. Ён прасочвае лёс шкатулкі, у якой захоўваўся тэкст Канстытуцыі Польскага каралеўства (1815 г.), на працягу амаль 200 год. З улікам таго, што на дадзены момант яна захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Маскве, аўтар ставіць пытанне аб неабходнасці вяртання і шкатулкі, і тэксту Канстытуцыі ў Польшчу.

Сярод праблем XIX і XX стст. у кнізе разглядаюцца гісторыя сялянскага перыядычнага друку (М. Беднажак-Лібера, З. Качыньскі), партыйна-палітычнае жыццё ў Польшчы ў перыяд «санацыі» (З. Запароўскі, С. Ю. Пастушка, А. Р. Сулаўка), дзейнасць па адраджэнні сялянскага руху ў канцы 1980-х гг. на Любліншчыне (А. Краўчык). Сюды ж адносіцца характарыстыка фондаў архіва Інстытута гісторыі сялянскага руху па гісторыі сялянскага прафсаюзнага руху ў 1980-я гг. (А. Пшыбыльска).

Для беларускіх спецыялістаў несумненны інтарэс прадстаўляюць сюжэты з гісторыі міжваеннай Польшчы. Так, С. Ю. Пастушка звяртае ўвагу на эвалюцыю палітычнага рэжыму Польскай рэспублікі і яго парламенцкі шлях ад дэмакратыі да аўтарытарнага праўлення. Даследчык падрабязна аналізуе заканадаўчыя акты і ўмовы, у якіх яны былі распрацаваны і прыняты, дае ацэнку дзейнасці Ю. Пілсудскага і яго паплечнікаў. Пытанне актыўнасці і ўзаемадзеяння прадстаўнікоў розных плыняў сялянскага руху ў Сенаце Польскай рэспублікі ў 1928–1930 гг. разглядае З. Запароўскі. У сваю чаргу, А. Р. Сулаўка звяртае ўвагу на працэс узнікнення і функцыянавання Сялянскай левай партыі (СЛП) у 1927–1928 гг. Ён адзначае, што спробы яе стварэння былі зроблены пасля роспуску Незалежнай сялянскай партыі, якая фактычна падпарадкоўвалася нелегальнай Камуністычнай партыі Польшчы. Аўтар сцвярджае, што ў сваёй дзейнасці СЛП сутыкнулася з адмоўным стаўленнем не толькі з боку афіцыйных улад, але і камуністаў, і беларускага сялянства. Гэта не дазволіла ёй правесці сваіх прадстаўнікоў у сейм падчас парламенцкіх выбараў 1928 г. Слабасць палітычных пазіцый партыі прывяла фактычна да заняпаду яе дзейнасці і ўліцця найбольш актыўных прадстаўнікоў у іншыя палітычныя сялянскія аб'яднанні.

Другі раздзел кнігі прысвечаны вядомым сялянскім дзеячам як дзяржаўнага, так і рэгіянальнага маштабу. Тут гаворка ідзе пра палітыка і прафесійнага гісторыка, прафесара Ю. Р. Шафліка (Я. Яхымэк), К. Межэеўскага (Т. Пекарскі), дзейнасць А. Багуслаўскага на Любліншчыне ў гады Першай сусветнай вайны (М. Віхманоўскі) і інш.

Асобны раздзел прысвечаны праблемам гісторыі рэлігіі, асветы і культуры. У ім разглядаецца культ езуітаў, прылічаных да ліку святых,

[1]*Туркоўскі Р.* «ІІ Рэч Паспалітая» ў лонданскай эміграцыі ў 1945–1991 гг. (Прэзідэнт – урад – квазі-парламенцкія інстытуты) // Российские и славянские исследования : науч. сб. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. Вып. 4. Минск : БГУ, 2009. С. 84–90; *Туркоўскі Р.* Заходняя прэса аб грамадска-палітычнай сітуацыі ў Польшчы ў 1945–1947 гг. // Российские и славянские исследования : науч. сб. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. Вып. 6. Минск : БГУ, 2011. С. 48–55.

у Плоцкай дыяцэзіі (Р. Лоло), аналізуюцца імёны жыхароў г. Пултуска і аколіц, нададзеныя ім пры хрышчэнні ў 1875–1910 гг. (К. Вісьнеўскі), сістэма выхавання дзяўчат у сельскагаспадарчых школах міжваеннай Польшчы (Б. Вагнер), стан сельскай асветы ў Варшаўскім павеце ў міжваенны перыяд (Й. Залэнчны), дзейнасць Галоўнай школы сельскай гаспадаркі ў гады Другой сусветнай вайны (С. Стэмпка) і інш. Цікавасць прадстаўляе артыкул А. Касескага пра гістарычныя інтэрпрэтацыі ў Польшчы аповесці М. Гогаля «Тарас Бульба». Даследчык адзначае, што доўгі час публікацыя гэтага твора на польскай мове па розных прычынах не была магчымай і толькі ў 2002 г., праз 150 год пасля смерці аўтара, аповесць пабачыла свет.

У чацвёртым раздзеле – «Абарона і бяспека краіны» – змяшчаюцца артыкулы па крыніцазнаўстве М. Нагельскага, Е. Мазурэка, М. і К. Карчыньскіх. Тут жа разглядаюцца пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай польскага грамадства да абароны краіны ў другой палове 1930-х гг. (М. Гелецінькі) і паводзінамі падчас чэхаславацкага крызісу 1938 г. (В. Владаркевіч), удзелам польскіх узброеных адзінак у баявых дзеяннях Другой сусветнай вайны (М. Лучнеўскі, А. Ч. Даброньскі), саветызацыяй Львоўскай вобласці ў 1944–1953 гг. (Д. М. Маркоўскі) і інш.

Невялікі раздзел прысвечаны адлюстраванню пытанняў аховы здароўя і сацыяльнай апекі. М. Мілеўска звярнула ўвагу на такую хваробу, як туберкулёз, з пункта гледжання гісторыка. Аўтар сцвярджае, што ў другой палове XIX ст. гэта была найбольш небяспечная заразная хвароба, і на прыкладзе Плоцкай губерні аналізуе прычыны захворвання, колькасць захварэўшых, спосабы лячэння і прафілактыкі і г. д. Іншыя матэрыялы гэтага раздзела прысвечаны ўспрыманню ў 1944 г. польскім грамадствам на вызваленых ад нямецкіх захопнікаў землях бежанцаў з Варшавы (К. Пшыбыш) і аналізу дапамогі ЮНРРА (*United Nations Relief and Rehabilitation Administration*) Польшчы на прыкладзе Пшасныскага павета ў 1945–1947 гг. (В. Лукашэўскі). Аб'ядноўвае згаданыя публікацыі думка аб тым, што пасля Другой сусветнай вайны польскае грамадства, як і эканоміка, знаходзілася ў крызісным стане, а таму аказанне любой дапамогі ўспрымалася з вялікай удзячнасцю. Тым больш ва ўмовах, калі ні польскі ўрад у эміграцыі, ні пракамуністычныя структуры не мелі сродкаў і магчымасцей для забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці.

Складальнікі зборніка не абышлі ўвагай і пытанне пазіцыі і памкненняў вясковай моладзі (шосты раздзел выдання): разглядаецца яе ўдзел у палітычных рухах (К. Русік), даецца ацэнка ідэй аграрызму (А. Вуйцік) і ўспрыманню ідэйнай спадчыны аднаго з заснавальнікаў сялянскага руху В. Вітаса (М. Вуйтовіч).

Апошняя частка кнігі – «Varia» – прысвечана аналізу натывізму – пратэстанцкага руху англійскіх перасяленцаў у ЗША (І. Русінава).

Завяршае выданне дадатак, у якім змешчаны фотаздымкі лістоў з віншаваннямі юбіляра і фотаздымкі, якія адлюстроўваюць розныя этапы і падзеі ў жыцці і навукова-дыдактычнай дзейнасці прафесара Рамуальда Вацлава Туркоўскага.

Далучаемся да віншаванняў юбіляра і адначасова раім гісторыкам звярнуць увагу на разглядаемае выданне. У ім прадстаўлены не толькі розныя этапы і падзеі з гісторыі Польшчы, але і разнастайныя метадалагічныя падыходы, якія дазваляюць зірнуць на, здавалася б, знаёмыя пытанні з новага ракурсу.

***Л. А. Козік***[1]

[1]*Любовь Антоновна Козик* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории южных и западных славян исторического факультета Белорусского государственного университета.
*Любоў Антонаўна Козік* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.
*Lioubov A. Kozik*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Southern and Western Slav's history, faculty of history, Belarusian State University.
E-mail: *lubov.kozik@gmail.com*